В результате армия и народ выступали как единое целое, осознанно шли на любые жертвы в борьбе с человеконенавистническим нацистским режимом. Закономерным результатом социальной ориентации советской системы, её изначальной направленности на реализацию принципов справедливости, явилось достижение 80 лет назад Великой Победы.

В современных условиях белорусское государство стремится сохранить свою социальную направленность, именно это делает его устойчивым в условиях роста международной напряжённости, режима необоснованных «санкций», попыток государственного переворота; в этой устойчивости в очередной раз проявляется общечеловеческий универсальный принцип социальной справедливости.

## Мая малая радзіма ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны

***Філіновіч А. Л., Лойка А. І.***

Летапіс в. Любачын і в. Азярніца, маёй малой радзімы, ў гады Вялікай Айчыннай вайны прадстаўлены ў выглядзе хронікі падзей. У дадзенай працы я адлюстраваў становішча нашых весак у час вайны. Мінула больш за 80 гадоў з часоў страшнага ліхалецця. Наша “малая Радзіма” таксама спазнала ўсе жахі вайны: акупацыю, генацыд насельніцтва, а таксама нескаронасць, мужнасць і барацьбу супраць нацысцкіх захопнікаў. У маёй працы былі выкарыстаны матэрыялы ўспамінаў сведкаў тых падзей, летапісу в. Любачын, матырыялы кніга “Памяць” Лунінецкага раёна, Брэсцкай вобл.

З успамінаў ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Макаеда Мікалая Фёдаравіча ў 1970 г.:*“Даўно скончылася вайна. 35 год на нашай зямлі няма вайны. 35 гадоў узыходзіць і заходзіць мірнае сонца, але вайна ніколі не забудзецца, асабліва для нас, для тых, хто прайшоў гэтую вайну і бачыў тое гора, тое няшчасце, якое яна прынесла нашаму народу. Вось і я з болем успамінаю аб сваім франтавым шляху. Я на свае вочы бачыў, як гінулі нашы*

*салдаты. Але як яны мужна абаранялі сваю Радзіму! Яны змагаліся за светлую будучыню наступных пакаленняў”.*

Пачатак вайны. Акупацыя. У ліпені 1941 года вёскі Любачын і Азярніца былі акупаваны нямецка-фашыскімі захопнікамі. Пачаліся тры гады цяжкіх выпрабаванняў. Гітлераўцы адразу ж пачалі ўсталёўваць свой «новы парадак», у аснову якога былі пакладзены генацыд і палітыка «выпаленай зямлі», рабаўніцтва, прымусовы ўгон мірных людзей у Нямеччыну.

Кантроль над акупіраванымі тэрыторыямі забяспечвала сістэма нямецкіх гарнізонаў і паліцэйскіх участкаў. Гітлераўцы імкнуліся атрымаць для сябе як мага болей харчу шляхам канфіскацый і кантрыбуцый. Канфіскоўвалі ўсё, што толькі маглі: збожжа, жывёлу, садавіну і гародніну, хатнюю птушку і г.д. Існаваў яшчэ і такі спосаб "нарыхтоўкі" харчу, як закупка яго ў насельніцтва. І гэта было на карысць акупантам, таму што яны плацілі за харч бескаштоўнымі папяровымі грашамі.

Акупацыйныя ўлады праводзілі падатковую палітыку, накіраваную на выцягванне грашовых сродкаў у мясцовага насельніцтва. Згодна з даведкай-патрабаваннем, немцы збіралі наступныя падаткі: з абароту капіталу, падаходны, падатак з будынкаў і арандную плату за знятае ў наём памяшканне. З прыбыткаў жыхара любога населенага пункта ўтрымлівалася 5 працэнтаў іх памеру "на нужды здравоохранения". У залежнасці ад якасці зямлі жыхары сельскай мясцовасці плацілі за яе ад 10 да 100 рублеў за 1 га.

Палітыка генацыду. «Ніводнае імя воіна, партызана, падпольшчыка, ніводнае імя жанчыны альбо дзіцяці, якія сталі ахвярай фашызму, не павінна быць пройдзена, прапушчана ці забыта...»

Ажыццяўленне гітлераўскай палітыкі генацыду ў адносінах да нашых людзей пачалося з першых месяцаў вайны. Смяротная кара стала, бадай, галоўным пакараннем за любое непадпарадкаванне альбо супраціўленне захопнікам, за падазрэнне ў сувязі з партызанамі.

Так 1 сакавіка 1943 хутары вакол вёскі Азярніца былі спалены гітлераўскімі карнікамі, а жыхары, якіх падазравалі ў садзейнічанні партызанскаму

руху, забіты. Грычыкі, Іван Цімафеевіч, н. у 1905, яго жонка Агаф'я Данілаўна, н. у 1905, сям'я адных з першых калгаснікаў створанага ў 1940 калгаса "Зара", іх двое малалетніх дзяцей: Марыя, н. у 1936, Мікалай, н. у 1941. Емельяновічы, Барыс Піліпавіч, н. у 1916, яго жонка Марыя Лукашаўна, н. у 1912. Емельяновічы, Емяльян Гаўрылавіч, н. у 1904, яго жонка Ганна Савічна, н. у 1904, іх трое дзяцей: Пётр, н. у 1921, член ВЛКСМ, Марыя, н. у 1937, Сцяпан, н. у 1940.

Успамінае брат Ганны Савічны Емельяновіч - Рыгор Савіч Юрцэвіч, жыхар г. Лунінец: *“Мужа маёй старэйшай сястры і іх старэйшага сына арыштавалі і закатавалі ў Лахве. Чацвёра дзяцей яна паспела адправіць з хаты, а сама з самымі маленькімі затрымалася. Карнікі падпалілі хату, а потым упіхнулі ў полымя жанчыну з двума дзецьмі»*

Емельяновічы, Яфімія Якаўлеўна, н. у 1908, яе дачка Ульяна Аляксандраўна, н. у 1937. Нагорныя, Марыя Рыгораўна, н. у 1894, яе двое дзяцей: Дзям'ян Іванавіч, н. у 1930, Марыя Савічна, н. у 1920, з дачкой Кацярынай, н. у 1938. Пятніца Іван Васільевіч, н. у 1890, дэпутат Любачынскага с/с, яго жонка Настасся Цімафееўна, н. у 1900, іх трое дзяцей: Ганна, н. у 1925, Пракоп, н. у 1930, Алена, н. у 1934.

Усяго за перыяд акупацыі ахвярамі фашысцкага тэрору сталі 52 мірныя жыхары в.Азярніца і 36 мірных жыхароў вёскі Любачын.

Успамінае дачка загінуўшай Пелагея Канстанцінаўна Крэмянеўская (Дэйлід), жыхарка г. Лунінец: *«Наша сям'я лічылася неблаганадзейнай у акупантаў. Сястра Марыя была выбрана дэпутатам Любачынскага сельсавета ў 1939-ым. Сусед-паліцай усё чакаў выпадку, каб ёй адпомсціць, таму з першым наборам адправіў у Германію. Нягледзячы ні на што, мы падтрымлівалі сувязь з партызанамі. У канцы жніўня 1942-га старэйшыя браты Лявонцій і Андрэй канчаткова пайшлі ў лес, сталі байцамі атрада. Бацькі разумелі, што бясследна для сям'і гэта не абыдзецца, адусюль чакалі небяспекі.*

*Аднойчы маці ўбачыла, што да хаты пад'язджаюць паліцаі на веласіпедах. Яна крыкнула бацьку. "Уцякай!", а сама выйшла насустрач нязваным*

*гасцям. Бацька скочыў праз акно і пабег да лесу. Па ім стралялі, але ён здолеў збегчы. Усё зло паліцаяў вылілася на маці. Яны пачалі біць яе, а потым, працягваючы паласаваць маці нагайкамі, пагналі яе перад сабою. Маці дапытвалі ў Лахве, потым у турме ў Лунінцы, але не дачакаўшыся ні слова, расстралялі на Баханова.*

*Між тым я з братам Дзям'янам рушыла ўслед за бацькам. Потым і малодшых дзяцей удалося пераправіць у атрад. Іх доўга не хацелі прымаць, але потым пакінулі ў сямейным лагеры разам з бацькам. Бацька вырабляў шкуры, займаўся шавецтвам, дзеці яму дапамагалі. На гэтым ахвяры нашай сям'і не закончыліся. Брат Лявонцій пасля партызанкі працягваў ваяваць на фронце, дзе і загінуў. А яшчэ адзін брацік, малодшы, памёр, калі ўжо з лесу прыйшлі".*

З успамінаў сваякоў загінуўшага Чэркаса Ф.:*"Нарадзіўся Чэркас Міхаіл Фёдаравіч ў 1926 годзе. Падчас вайны разам са сваёй сям'ёй дапамагаў партызанам: адзеннем, канямі, мясам. Ягоны бацька, Фёдар Яхімавіч, 1944 годзе быў арыштаваны немцамі, два тыдні сядзеў у Лунінцы ў турме. Міхаіл Фёдаравіч загінуў у 1944 годзе. Яго схапілі дома, доўга збівалі, спрабуючы даведацца, дзе схаваны прадукты, адзенне. Затым яму ўдалося ўцячы, але Міхаіла зноў схапілі і расстралялі ў вёсцы Любачын. Пасля гэтага немцы і паліцаі прыехалі забіраць сям'ю. Забралі ўсіх, хто быў у доме: дачку Надзю (12 гадоў), дзяўчынку (1,5 гады) з зыбкі забралі, а маці ў гэты дзень вазіла перадачу ў Лунінец. Вяртаючыся дадому, бачыла, як везлі ўсю яе маёмасць (Дом немцы разбурылі, а маёмасць прымусілі суседзяў даставіць у Лунінец). Чаркас Фёдар Яхімавіч быў расстраляны ў Лунінцы, дзяўчынка Надзя і малая расстраляныя ў вёсцы Лахва. У гэты ж дзень была забітая ў Лахве ўся сям'я стрыечнага брата Чаркаса Фёдара Яхімавіча: Сыцэвіч Уладзімір, Сыцэвіч Арына і іх дзеці – Міхаіл 4-х гадоў і Вася 2-х гадоў".*

У 1942 былі вывезены на прымусовыя работы ў Германію многія нашы землякі, адкуль не вярнуліся: Дубініч Павел Пятровіч, н. у 1925. Калянковіч Сцяпан Фёдаравіч, н. у 1921. Макаед Мікалай Герасімавіч, н. у 1921.

У вайны няма вачэй – яна не бачыць, хто стаіць перад смерцю: свой ці чужынец. І часам, нярэдка ненаўмысна, а па трагічнаму, недарэчнаму збегу абставін ад рук сваіх гінулі свае. Гэта таксама ахвяры Вялікай Айчыннай. Ахвяры, аб якіх стараліся не ўспамінаць. Угледзімся ў суровую праўду дакументаў: *"8.06.44. На шаляху Любачин-Озерница двумя минами подорвано... крестьянин с лошадью бороновавший шлях".* Партызанскі рух. Многія нашы землякі з яўляліся актыўнымі ўдзельнікамі партызанскага руху, былі сувязнымі, разведчыкамі, байцамі брыгады імя Кірава. Актыўным удзельнікам партызанскага руху быў Емельяновіч Васіль Якаўлевіч, які з’яўляўся разведчыкам брыгады імя Кірава, у атрадзе імя Кірава.

З успамінаў Васіля Якаўлевіча Емельяновіча, былога жыхара в. Любачын:*«Я ўступіў у партызанскі атрад імя Кірава ў 1943 годзе. Да гэтага быў сувязным. Камандзір атрада Швяцоў. Наш атрад размяшчаўся на тэрыторыі Лунінецкага раёна, 94 квартал Соплева. Калі ў атрадзе сфармавалася шмат сіл, яго расфарміравалі на тры: Сталінскі, Калінінскі і «За Радзіму». Камандзірам нашага атрада быў Калітанаў Міхаіл. У 1943 г. на нашай тэрыторыі была блакада. Сталінскі атрад застаўся ля Соплева, Калінінскі – накіраваны пад Добрую Волю. Наш атрад быў накіраваны за Баранавіцкую чыгунку, там мы размясціліся паміж в. Багданаўка і в.Плотніца. Атрад налічваў каля 80 чалавек. Быў дадзены загад весці рэйкавую вайну на чыгунцы Баранавічы-Пінск. Я быў разведчыкам, мой участак быў на станцыі Малькавічы.У разведку прыходзілася хадзіць за 20-30 кіламетраў. Асабліва было цяжка зімой, калі прыходзілася спаць на снезе, не распальваючы вогнішча. Асноўнай маёй задачай было даведацца рух баявых эшалонаў, колькасць баявой сілы, час і кірунак руху. Неаднаразова выходзілі ноччу на гэтую чыгунку і ўзрывалі масты, рабілі засады на дарогах. У красавіку 1944 года ў Малькавічах нашым атрадам быў разбіты нямецкі гарнізон, узарваны склад з боепрыпасамі. У чэрвені 1944 г. гэтыя месцы былі вызваленыя Чырвонай Арміяй. Я быў накіраваны ў войска КДБ. Сфарміравалі полк у Пінскім раёне і накіравалі нас на знішчэнне паліцаяў, дэзерціраў, уласаўцаў у*

*Ровенскую вобласць (Украіна). У 1945 годзе мяне прызначылі ў памежны атрад у Прыбалтыку, дзе я служыў да 1950 году. Потым пачаў працаваць у калгасе «Сацыялізм».* Васіль Якаўлевіч узнагароджаны Ордэнам Айчыннай вайны 2 ступені.

Некаторыя з удзельнікаў партызанскага руху загінулі ў барацьбе з фашысцкімі захопнікамі. Гэта: Бярозка Максім Міхайлавіч, н. у 1922, партызан атрада імя Сталіна брыгады імя Кірава, загінуў у лістападзе 1943, пахаваны ў в. Азярніца. Кананавіч Васіль Сцяпанавіч, н. у. 1926, з кастрычніка 1943 – партызан атрада імя Калініна брыгады імя Кірава, загінуў 8.07.1944, пахаваны ля в. Белае Возера. За сувязь з партызанамі быў пакараны Чэркас Фёдар Яфімавіч, н. у 1906, у перыяд вайны – солтыс у в. Любачын, партызанскі сувязны брыгады імя Кірава Пінскага злучэння, расстраляны вясной 1944, пахаваны ў в. Лахва.

З успамінаў Пелагеі Канстанцінаўны Крэмянеўскай (Дэйлід), жыхаркі г. Лунінец:*“Старэйшыя браты і я ўжо ваявалі ў партызанах, паспеў выратавацца і бацька. Маці схапілі немцы і расстралялі. Хату нашу спалілі. Чацвярых малодшых дзяцей (у сям'і нас было дзевяць) не даў кінуць у агонь Фёдар Чэркас. Ён забраў іх да сябе, дзе яны спакойна перазімавалі. Але вясной паліцаі пачалі абурацца: – Партызанскіх дзяцей хаваеш! Выратавальніка расстралялі”.* Памяць аб загінуўшых застанецца знамі і ўвекавечана ў помніках

10 ліпеня 1944г. вёскі Любачын і в. Азярніца былі вызвалены войскамі 1-га Беларускага фронту ў ходзе развіцця наступлення на Баранавіцка-Брэсцкім напрамку ў час другога этапу аперацыі "Баграціён". Баявыя дзеянні тут вялі войскі 61-ай армій 55-й Мазырскай (палкоўніка В.П. Шмыглова) стралковай дывізіі ва ўзаемадзеянні з партызанскай брыгадай імя С.М. Кірава Пінскага партызанскага злучэння.

Воіны-землякі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. «Колькім дзецям вярнулі дзяцінства, падарылі радасць і вясну. Радавыя Арміі Савецкай, людзі, якія перамаглі вайну» Байцы партызанскай брыгады імя С.М. Кірава ўліліся у

рады Чырвонай Арміі і працягвалі змагацца з гітлераўскімі захопнікамі на франтах Вялікай Айчыннай вайны і вярнуліся з Перамогай. Многія з іх праявілі мужнасць і гераізм і адзначаны ўзнагародамі. Цяжка было воінам-франтавікам, але яны ішлі да перамогі.

Пятніца Адам Фёдаравіч

(12.07.1914-09.12.1996)



З 1941 па 1943 год знаходзіўся ў партызанскім атрадзе імя Сталіна ў Чарнігаўскай вобласці. Быў разведчыкам. Браў удзел у баях за вызваленне Ковеля, Любліна, Варшавы. У 1945 г. вызваляў нямецкія гарады, а затым і Берлін. Узнагароды: медаль «За ўзяцце Берліна», Ордэн Айчыннай вайны 2 ступені, падзяку за ратную працу ў барацьбе за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы.

Ермаковіч Фёдар Апанасавіч

(19.05.1911-21.02.1991)



У 1941 г. ваяваў у 247 дывізіі Беларускага фронту ў 916 часці ў Любліне. На фронце быў мінамётчыкам. Баі вяліся каля ракі Вісла, Одэр, каля горада Лебусе. Быў цяжка паранены, знаходзіўся ў шпіталі г.Познань. Узнагароды: медаль «За адвагу», медаль «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.», Ордэн Айчыннай вайны 1 ступені, медаль «20 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне», медаль «25 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне», медаль «30 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне».



Кнырэвіч Піліп Піліпавіч

(1904-21.01.1991)

Ваяваў на першым Беларускім фронце. Радавы. Быў першым нумарам станковага кулямёта. Штурмаваў і вызваляў горад Варшаву. Удзельнічаў у баях за вызваленне Берліна. Пры знішчэнні фашысцкіх груповак у горадзе Берлін узяў у палон 42 нямецкія захопнікі. Узнагароды: Ордэн Славы 3 ступені, Ордэн Айчыннай вайны 2 ступені, медаль «За вызваленне Варшавы», медаль «За ўзяцце Берліна», медалі «За Перамогу над фашысцкай Германіяй», «20 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне», «25 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне», «30 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне», «50 гадоў Узброеных сіл СССР», «60 гадоў Узброеных сіл СССР».



Емельяновіч Даніл Міхайлавіч

(24.12.1923-07.05.2000)

З 1943 г. быў у партызанскім атрадзе, у 1944 г. пайшоў на фронт, ваяваў на 1, 2, 3 Прыбалтыйскім фронце, затым патрапіў у 215 запасны полк з ліпеня па жнівень, у стралковым палку – са жніўня па красавік 1944 г. быў пераведзены спачатку ў 892 гвардзейскі полк, затым у артылерыйскі. З 18 студзеня па 20 сакавіка 1945 г. браў удзел у баях за вызваленне гарадоў Сахачоў, Скрынявішча, Ловіч, Хоэнзальц, Аляксандраў, Агрэнау, Люблін, Альтдаім, Шэпланцы, Лукоціца, Крэйца, Вольдэнберг, Дрэздэн, Штадгарт. Узнагароды: Ордэн Айчыннай вайны 1 ступені, медалі «За адвагу», «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Берлінам»,

«20 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне», «25 гадоў Перамогі 30 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне»



Пятніца Фёдар Цімафеевіч

(21.01.1901-27.04.1993)

У перыяд Вялікай Айчыннай вайны пайшоў добраахвотнікам на фронт. Ваяваў на Першым Беларускім фронце. 14 студзеня 1945 года браў удзел у наступленні супраць фашысцкіх захопнікаў на рацэ Одэр. Ваяваў за вызваленне Варшавы, Берліна. Узнагароды: Ордэн Айчыннай вайны 2 ступені, медалі «За ўзяцце Берліна», «За вызваленне Варшавы», «За Перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.», «20 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне», «25 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне», «30 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне», «50 гадоў Узброеных сіл СССР», «60 гадоў Узброеных сіл СССР».



Юрцэвіч Максім Цімафеевіч

(02.09.1919-13.05.1992)

21 кастрычніка 1940 г. быў прызваны на службу ў рады Чырвонай Арміі. Служыў у г.Кіравабадзе 157 палка кавалерыйскай часткі. У перыяд Вялікай Айчыннай вайны прыняў удзел у вызваленні Кіева. З 1944 года служыў у 125 гвардзейскім асобным батальёне, дзе разам з таварышам разміціравалі Прагу. Удзельнічаў у вызваленні гарадоў Гданьск, Калінінград, Усходняй Памераніі (80 км. ад Берліна). Узнагароды: Ордэн Айчыннай вайны 2 ступені, Ордэн Славы 3 ступені, Ордэн Чырвонай Зоркі, медалі «За баявыя заслугі», «За Перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.», «20 гадоў Перамогі

ў Вялікай Айчыннай вайне», «25 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне», «30 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне», «50 гадоў Узброеных сіл СССР», «60 гадоў Узброеных сіл СССР».

Кананові́ч Іван Сцяпанавіч

(23.02.1924-31.01.2011)



З 1941 года ўдзельнічаў у партызанскім руху. Быў партызанскім сувязным. У 1944 годзе быў прызваны ў армію і адпраўлены на фронт, дзе ваяваў у 920 стралковым палку 247 стралковай дывізіі на 1 Беларускім фронце. 13 сакавіка 1945 г. удзельнічаў у прарыве гітлераўскага асяроддзя на Радамскім напрамку, а 26 красавіка 1945 г. – у прарыве плацдарма на Берлін. Браў удзел у вызваленні Варшавы. Узнагароды: Ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу», медалі «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна», «За Перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.», «20 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне», «25 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне», «30 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне», «50 гадоў Узброеных сіл СССР», «60 гадоў Узброеных сіл СССР».

Рамановіч Дзмітрый Апанасавіч:*«Я быў прызваны ў войска на другі дзень вайны, 23 чэрвеня 1941 года, у Кузадзееўскім раёне Кемераўскай вобласці. Я служыў агнямётчыкам у 420-м стралковым палку. Полк быў сфарміраваны ў Кандалакіі, а затым пасланы на фінскую мяжу. Тут я непасрэдна браў удзел у трох баях. Потым полк быў пераведзены на захад. Пад Калінінградам я атрымаў асколачнае раненне ў грудзі. Лячыўся ў шпіталі ў Коўне. Паранены быў у студзені 1945 года. Пасля шпіталя вярнуўся ў строй. Скончыў вайну ў Нямеччыне неўзабаве пасля вяртання на фронт. Маю ўзнагароды. Ва Ўсходняй Прусіі за ўзяцце «языка» быў узнагароджаны*

*Ордэнам Славы 3 ступені».* Дзмітрый Апанасавіч узнагароджаны медалямі: «За Перамогу над Германіяй», «25 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне», «30 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне», «50 гадоў Узброеных сіл СССР».

Чыкун Іван Васільевіч:*"Нарадзіўся ў 1906 годзе ў вёсцы Любачын у сялянскай сям'і. Дзяцінства прайшло ў цяжкіх умовах. У 1923 годзе застаўся сіратой. У 1926 годзе ажаніўся. Меў у сям'і чацвёра дзяцей. Малодшы сын загінуў у Айчынную вайну. На фронт быў прызваны ў г.Канатопе. Удзельнічаў у вызваленні гарадоў: Кіева, Львова, Чэнстахова. Вызваляў Чэхаславакію, Венгрыю. У снежні 1945 гады з Вугоршчыны вярнуўся дадому. Працаваў у калгасе. З 1961 гады на пенсіі. Узнагароджаны Ордэнам Айчыннай вайны 2 ступені".*

Рамановіч Міхаіл Дзмітрыевіч:*«У чэрвені 1942 года я быў сагнаны немцамі з вёскі Любачын у Германію. Знаходзіўся ў Памераніі 3 гады. Адразу быў мабілізаваны ў войска. Браў удзел у фарсіраванні ракі Одэр. Наша частка з баямі дайшла да Берліна. Непасрэдна ўдзел у штурме горада не прымаў. У 1946 годзе 9 траўня браў удзел у парадзе нацый. Парад праходзіў у Берліне каля Брандэнбургскай брамы. Прымалі ўдзел нашы войскі, войскі саюзных дзяржаў. Прымаў парад маршал Жукаў і маршалы саюзных войскаў. Маршал Жукаў павіншаваў усіх з гадавінай Вялікай Перамогі. Я служыў у навучальным батальёне памагатым камандзіра ўзвода. Дэмабілізаваны ў 1946 годзе ў званні старшага сяржанта».*

Макаед Мікалай Фёдаравіч:*«Даўно скончылася вайна. 35 гадоў на нашай зямлі няма вайны. 35 гадоў узыходзіць і заходзіць мірнае сонца, але вайна ніколі не забудзецца, асабліва для нас, для тых, хто прайшоў гэтую вайну і бачыў тое гора, тое няшчасце, якое яна прынесла нашаму народу. Вось і я з болем успамінаю аб сваім франтавым шляху. Я на свае вочы бачыў, як гінулі нашы салдаты. Але як яны мужна баранілі сваю Радзіму! Яны змагаліся за светлую будучыню наступных пакаленняў. Вайна мяне заспела ў роднай вёсцы Азярніца. У гэты час я быў дэпутатам сельскай рады. Мяне прызвалі ў войска,*

*калі мне было 37 гадоў. Адправілі на фронт. Служыў у 65 палку сапёрам. Удзельнічаў у баях на рацэ Нёман, у горадзе Маладзечне. Некалькі разоў быў у разведцы. У 1945 годзе патрапіў у Менск, у лякарню. Пасля бальніцы вярнуўся дадому і працаваў у калгасе».*

Шмат нашых землякоў загінула на франтах Вялікай Айчыннай вайны. 47 чалавек з вёскі Любачын і 58 чалавек з вёскі Азярніца. Вайна прынесла незлічоныя беды і пакуты нашаму народу. У нашых сэрцах – боль. Ён не сціхне ніколі. Гэты боль – генетычная памяць беларускага народа, наш абярэг, напамін усім наступным пакаленням берагчы мір.

## Социокультурный ландшафт Беларуси в годы после Великой Отечественной войны

***Елистратова А. В., Звездная С. С., Струтинская Н. В.***

Во время Второй мировой войны наша страна пережила тяжелые испытания и последствия. Великая Отечественная война (далее – ВОВ) обрушилась на Беларусь 22 июня 1941, оставив после себя разрушения и большие потери населения [1]. Страна стала ареной жестоких боев и оккупации, что подорвало ее экономическое состояние. После войны Беларусь начала активно восстанавливать экономику и инфраструктуру, что привело к развитию промышленности и сельского хозяйства.

Война, принесенные ею разрушения и демографические потери, оказала влияние на формирование белорусской культуры и идентичности, укрепив историческую память и национальное достоинство страны, стала моментом массового героизма и единения белорусского народа [2]. Жесткие разрушения и оккупационный режим в годы войны оставили глубокие шрамы в коллективной памяти, что повлияло на культурные ценности и общественные нормы страны [3], [4].